2 Аникеев, А. А. НСДАП: идеология, структура и функции / А. А. Аникеев, Г. И. Кольга, Н. Е. Пуховская. – Ставрополь : Изд-во СГУ, 2001. – 323 с.

3 Ширер, У. Взлёт и падение Третьего рейха / У. Ширер; под ред. и пер. с англ. О. А. Ржешевского. – Москва : АСТ, 2015. – 1216 с.

4 Akten der Reichskanzlei Weimarer Republik. Das Kabinette Müller (Juni 1928 – März 1930) [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://www.bundesarchiv.de/aktenreichskanzlei/1919-1933/0000/mu2/index.html. – Дата доступа : 14.03.2020.

5 Бонвеч, Б. История Германии: учебн. пособие в 3 тт. / Б. Бонвеч, Ю. В. Галактионова. – Москва : КДУ, 2008. – Т. 2. – 672 с.

6 Akten der Reichskanzlei Weimarer Republik. Das Kabinette Brüning (März 1930 – Juni 1932) [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://www.bundesarchiv.de/aktenreichskanzlei/1919-1933/0000/bru/index.html. – Дата доступа : 14.03.2020.

7 Hitler Adolf: Reden, Schriften, Anordrungen: Februar 1925 bis Januar 1933 – Bd. 3. – Zwischen den Reichstagswahlen Juli 1928 – September 1930; hrsg. und kommentiert von Christian Hartmann. – München: New Providence: London : Paris, 1995. – 513 c.

**УДК 94(476) «1906/1907»**

***У. У. Кручко***

## ДЗЕЙНАСЦЬ II ДЗЯРЖАЎНАЙ ДУМЫ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ НА СТАРОНКАХ ГАЗЕТ «НАША ДОЛЯ» І «НАША НІВА»

*Артыкул прысвечаны адлюстраванню II Дзяржаўнай думы Расійскай імперыі на старонках беларускага нацыянальнага друку – газет «Наша доля» і «Наша ніва». Аўтары і карэспандэнты гэтых выданняў у значнай ступені выяўлялі пазіцыі Беларускай сацыялістычнай грамады. Публікацыі гэтых выданняў выказвалі пазіцыі Грамады і асвятлялі розныя бакі выбараў у II Дзяржаўную думу у беларускіх губернях, а за тым і пазіцыі дэпутатаў у зямельным, нацыянальным, рэлігійным і іншых пытаннях.*

У перыяд дзеяння II Дзяржаўнай думы левыя партыі дзейнічалі адзіным блокам. Так, у Мінску мясцовыя арганізацыі БСГ, Бунда, ППС і РСДРП утварылі перадвыбарны блок у кастрычніку 1906 г. Гэты левы блок на гарадскіх выбарах у студзені 1907 г. атрымаў перамогу. Але на выбарах у пяці заходніх губернях левыя сілы пацярпелі паражэнне, не правёўшы ў Думу ніводнага свайго кандыдыта [1, с. 334].

Падзеі, звязаныя з выбарамі ў Думу і яе дзейнасцю, знайшлі адлюстраванне на старонках першых легальных беларускіх газет – «Нашай долі» і «Нашай нівы». Гэтыя газеты былі не толькі шчыльна звязаныя з Беларускай сацыялістычнай грамадой. Яе аўтары ўваходзілі ў склад БСГ і адлюстроўвалі яе пазіцыі. У газетным нумары «Нашай Долі» ад 20 верасня 1906 г. у артыкуле «Выбары ў Дзяржаўную думу ў Віленскай губерні» былі асветлены падзеі выбарчага сходу. У газеце было напісана, што ўжо 4 кастрычніка павінен адбыцца з’езд, дзе члены гэтага з’езду будуць абмяркоўваць склад кандыдатаў. Яны адзначалі, што гэтымі кандыдатамі сталі памешчыкі. Акрамя гэтай навіны, грамадаўцамі быў устаўлены каментар: «нядрэнна было б, каб і мужыкі падумалі аб выбарах» [2, с. 5].

Таксама у 4-м нумары газеты ідзе размова пра выбары ў II Дзяржаўную думу. У артыкуле адзначалася, што сілавыя метады барацьбы сялян былі беспаспяховыя: «зразумелі выбарчыя ад мужыкоў і работнікаў, што зямлю трэба дабываць ня сілаю, не рабаваннем, а законам». БСГ раіла сялянам і работнікам ісці прымаць удзел у выбарах у

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

II Дзяржаўную думу. Ужо ў 5-ым нумары з’яўлюцца звесткі пра ўдзел у выбарчай кампаніі, па інфармацыі газеты, «беднаты». «Баялась бедната, што не ўдасца ёй у Вільні выставіць свайго кандыдыта. Аж раптам кандыдаты знайшлісь, і не адзін, а цэлых два». Першым кандыдатам з’яўляўся ксёндз Станіслаў Мацаевіч, другі – пан Юзэп Манцівілл [3, с. 1; 4, с. 3].

У газеце «Наша Доля» грамадаўцы выказваюцца наконт дзейнасці чорнасоценцаў пад час выбараў у Дзяржаўную думу. «Ёсць: «исцина рускіе людзи». Гэтыя людзі, што у мінуўшую восень спраўлялі “морды” ва ўсёй расукай дзяржаве, што абхляпалі крывёю вуліцы Беластока і Седлеца». Як лічылі члены БСГ, што «афіцыйная ўлада надта дапамагае чорнасоценцам, каб яны пралезлі ў Думу да атабралі права выбару беззямельнгым мужыкам і іншым». Грамада раіла работнікам, сялянам ісці патрабаваць «сапраўднай грамадзянскай свабоды» і сапраўднага парламенту [5, с. 6].

БСГ вяла барацьбу з іншымі арганізацыямі за выбаршчыкаў. Так, у «Нашай Ніве» было напісана: «На выбарах да першай Думы фальшывыя прыяцелі народу чы мала гдзе выбіралі дэпутатамі дрэнных людзей. Наступаюць цяпер новыя выбары. І на гэтых выбарах працавіты народ не павінен слухаць хітрых слоў сваіх ворагоў, а выбіраць толькі тых людзей, каторыя па праўдзе хочуць яму дабра». БСГ відавочна дае зразумець, што людзьмі, якія дапамогуць народу, з’яўляюцца яны. Падчас дзейнасці II Дзяржаўнай думы, як і ў I Дзяржаўную думу, актывізавалася дзейнасць чорнасоценскіх арганізацый. БСГ пісалі, што «гэтыя людзі нацкоўваюць адзін народ да другога, рускіх на жыдоў ды палякоў» [6, с. 2; 7, с. 1].

Газета каментуе дзейнасць міністра Пятра Сталыпіна пад час выбараў у II Дзяржаўную думу. У артыкуле было пісана, што «расійскія газеты разнеслі па ўсёй Расіі навіну дрэнную: Сталыпін, галоўны міністар, заявіў, што Дума павінна быць паслухмянай у адносінах да самадзяржаўнай улады, бо інакш яе зноў разгоняць». Аўтар задаваўся пытаннямі: «А якая ж карысць з Думы, якая будзе баяцца смела сказаць праўду? Дзеля чаго яна збіраецца?». Тут жа было падкрэслена, што ўсім трэба выбіраць сваіх дэпутатаў, бо «інакш чорныя сотні і іншыя ворагі шчасця і свабоды народнай запануюць усім краям» [8, с. 2].

Аўтары «Нашай долі» і «Нашай нівы» па-свойму бачылі існаванне Дзяржаўнай думы. Яны пісалі, што трэба было ліквідаваць Дзяржаўны савет, на яго месцы павінна стаць Дзяржаўная дума. У функцыі Думы павінны уваходзіць права прымаць законы, права на фіксаванне і збор падаткаў. Дума павінна забяспечываць бяспеку кожнага грамадзяніна, свабоду «сумлення», свабоду слова і друку, саюзаў і страйкаў. Для змянення палітычнай сістэмы Расійскай імперыі было неабходна абвясціць права падаваць петыцыю ў Думу. Але гэтая прапанова не магла ўвайсці ў ужытак у тагачаснай сітуацыі, бо не было падобнага палітычнага і парламентскага вопыту ў Расійскай імперыі ў параўнанні з краінамі Заходняй Еўропы [9, с. 1].

Аўтары адзначалі, што ў шматлікіх беларускіх валасцях на выбарах атрымалі перамогу «мужыкі-сацыялісты». Але ў іншых валасцях была іншая сітуацыя, калі праз т. в. «мужыкоў» галасавалі памешчыкі. БСГ атрэагавала наступным чынам: «і стыд быў б за такіх дэпутатоў, і за такія выбары…». Народу трэба «самому ісці ў губерні разам, злучыцца з гарадскімі выбаршчыкамі і не пусціць у Думу памешчыкаў» [10, с. 1–2].

Вельмі цікавыя звесткі пра вынікі выбараў ёсць у 4-м нумары газеты «Наша Ніва». Як ужо адзначалася, Беларуская сацыялістычная грамада і левыя партыі стварылі адзіны передвыбарчы блок. Так, з Вільні адным дэпутатам стаў прадстаўнік сацыялістаў. Увогуле, па матэрыялах «Нашай Нівы», у Віленскай губерні было каля 16 дэпутатаў-сацыялістаў, з іх 12 – Вільна, 2 – Новавілейск, 2 – Смаргонь. Таксама зафіксаваны звесткі пра выбар дэпутатаў, «што належаць да сацыялістычных партый». Вельмі цікавы выпадак адбыўся ў Ашмянскім павеце, калі дэпутатамі сталі «мужыкі», што, як яны



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сцвярджаюць, належаць да беларускай сацыялістычнай грамады. У Віцебскім павеце з 16 дэпутатаў 14 было левымі. Было вядома, што на валасных выбарах у Навагрудскім павеце прайшлі ўпаўнаважаныя, якія з'яўляліся членамі БСГ [11, с. 4–6].

Пад час адкрыцця Дзяржаўнай думы паліцыя наладзіла ператрус сярод дэпутатаў-сацыялістаў. На гэтыя падзеі БСГ адрэагавала наступным чынам: «…самыя народныя прадстаўнікі папалі пад надзор паліцыі нават у Думе. У тым пакою, гдзе збіраюцца дэпутаты сацыялісты, паліцыя зрабіла обыск ….» [12, с. 2–3].

На пасяджэнні ў Думе 6 сакавіка 1907 г. найперш прыступілі да зяцвярджэння выбараў думскіх дэпутатаў. Дэпутаты-сацыялісты рэвалюцыйнай плыні на гэтым пасяджэнні патрабавалі, «каб для хадакоў далі ў Думе асобнае месца, каб яны маглі паслухаць, што робіцца ў Думе». 7 сакавіка адным з патрабаванняў левых было, каб камісія Думы накарміла галодных [13, с. 1–2; 14, с. 1].

На пасяджэнні 12 і 13 сакавіка разглядалася пытанне аб скасаванні ваенна-палявых судоў. У газеце на гэты конт адзначылі словы святара Ціхвінскага, як ён параўноўваў суды з забойствам у імя Бога, аргументуючы тым, што «ўсяляка забойства – злачынства, але забойства па суду, забойства ў імя Бога – гэта найлепшае з забойстваў» [15, с. 2].

Як паведамляла «Наша ніва», 18 мая 1907 г. была адкрытая аграрная камісія, якая павінна разабраць аграрную рэформу і «знайсці спосаб, як задобрыць народ зямлёю». Сутнасць гэтай рэформы была ў тым, што зямля павінна быць канфіскаваная ў памешчыкаў. З гэтым пагадзіліся сацыялісты і кадэты. Але «правыя» дэпутаты, у асобе дэпутата ад «мужыкоў» Віленскай губерні Пілейка, напісалі пратэст. Яны не пагаджаліся на прымусовае адабранне зямлі ў памешчыкаў. Падобная сітуацыя была і ў дэпутатаў ад іншых беларускіх губерняў. Так, мінскія сялянскія дэпутаты Мельнік і Грудзінскі «пад камандаю правых, пайшлі яны не па справядлівай дарозі…». Было адзначана, што пра беларускі край не было гаворкі пад час гэтага пасяджэння, аргументуючы тым, што «ніхто не казаў аб тым, як цяжка жывецца народу ў Беларусі, чаго трэба для нашага народу». Далей ідзе крытыка беларускіх дэпутатаў, бо яны, як лічыў аўтар публікацыі, не даюць ніякай справаздачы з Думы, яны не маюць нічога супольнага з тымі людзьмі, якія паслалі «пастаяць у Думе за беларускі край». Падводзячы вынікі карэспандэнт падкрэсліў – «праўды відаць, кажуць, што народ беларускі найцямнейшы ды найбольш прыбіты: такіх ён і дэпутатаў выбраў» [16, с. 1–2].

На гэтым жа пасяджэнні быў прыняты праект аб чыншы і месцячковай і гарадской арэндзе зямлі ў беларускіх губернях. Сутнасць гэтага праекту была ў тым, што дзяржава выкупала гэтыя землі ў арэндатараў і ў чыншавікоў. І гэтая зямля пераходзіць пад уласнасць тым, хто гэтую зямлю арэндаваў [17, с. 5].

Таксама «Наша Ніва» друкавала заявы дэпутатаў з заходніх губерняў, дзе яны абвесцілі сваю праграму для чатырох губерняў – Ковенскай, Сувальскай, Віленскай і Гродзенскай. Карэспандэнты «Нашай Нівы» падтрымалі гэтыя заявы: «Справядліва кажуць дэпутаты, што ў нашым краю сам павінен задаволіць жаданне зямлі працуючага вясковага люду… Споўніць вялікую работу найлягчэй будзе ў нас на месцы». Па сутнасці, гэтыя ідэі былі ідэямі самакіравання і аўтаноміі беларускага краю, якія БСГ адстойлівала з пачатку існавання партыі [18, с. 3–4].

Акрамя саюзаў і кантактаў з дэпутатамі Думы, у Беларускай сацыялістычнай грамады былі і спрэчкі па культурным і нацыянальным пытанні з дэпутатамі. Так, на адным з выступаў у Думе дэпутат-селянін, які сам сябе лічыў «прадстаўніком Паўночна-Заходняга краю», дзе, акрамя яго, і праваслаўныя, і каталіцкія сяляне «маюць патрэбу ў зямлі, а не аўтаноміі». Гэтага дэпутата падтрымаў ягоны сябар Шыманскі. Ён сказаў, што «ў нашым краі ўвогуле ўсе рускія: у адной Мінскай губерні каля 2,5 млн рускіх праваслаўных, а католікаў – 60 тыс з лішнім, то як можна, каб яны над імі мелі верх; гэтага не будзе, яны не саступяць; іх край рускі, а не польскі». Супраць такога памылковага разумення БСГ змагалася ў час выбараў у ІІ Дзяржаўную думу. «Наша

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Ніва» надрукавала тлумачэнне аднаго дэпутата: «Нам, праваслаўным, кажуць, што мы рускія, значыць, людзі іншыя ад каталікаў; кажуць, што каталікі – гэта ляхі. А па папраўдзе, то гэта адно брахня. Каталікі – гэта такія самыя людзі, як і праваслаўныя; яны гавораць па-нашаму і жывуць так сама цяжка, як і мы, праваслаўныя. Мы ўсе – браты адной крыві і з адной зямлі беларускай. Мы не рускія і не палякі, а беларусы, і кожны гэта павінен памятаць» [19, с. 4].

Акрамя спрэчак у нацыянальным пытанні былі спрэчкі і паміж левымі партыямі. Падобным прыкладам з'уляецца спрэчка паміж БСГ і літоўскімі сацыялістамі ў аграрным пытанні. Грамадауцы пісалі па гэтай падставе: «…у сваёй «дэкларацыі» казалі яны, бытцам, каб здаволіць нашу вёскавую працавітую беднату, досі будзе аддаць ў рукі народу землі казённыя, "удзельныя", духавенства, ды "майораты". Але ж мы тады ясна паказалі, што з такога надзелу нікому ніякой карысці ня будзе, бо на кожных 26 мужыкоў выпадзе ўсяго па адной дзесяціне здатнай да гаспадаркі зямлі …». У выніку літоўскія сацыялісты прапанавалі ўсе землі, якія належалі царкве, касцёлу, манастыроў ды вялікіх і сярэдніх памешчыкаў, павінны быць адабраны без выкупа. Далей, усе гэтыя землі павінны былі перайсці ў краёвы зямельны фундуш, якім павінны будуць распараджацца народныя дэпутаты, якія выбіраліся тайным і простым галасаваннем. Гэтая «краёвая народная ўправа» павінна вызначаць, якога памеру можна адбіраць маёнтак [20, с. 5].

Такім чынам, можна адзначыць, што звесткі, адублікаваныя ў газетах «Наша Доля» і «Наша Ніва», адлюстроўваюць найбольш значныя для грамадскага жыцця Беларусі падзеі і пры належным аналізе могуць праліць святло на малавядомыя старонкі дзейнасці Беларускай сацыялістычнай грамады і ўвогуле на дзейнасць беларускага нацыянальнага руху.

**Літаратура**

1 Гісторыя Беларусі: навуковае выданне : у 6 т. Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч, В. Яноўская, С. Рудовіч і інш.; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэдактар) і інш. – Мінск : ЭКАперспектыва, 2007. – 519 с.

2 Выбары ў Дзяржаўную думу ў Віленскай губерні // Наша Доля. – 1906. – № 3. – С. 5.

3 Вільна 27 верасня // Наша Доля. – 1906. – № 4. – С. 1–2.

4 Кандыдаты ад Вільны // Наша Доля. – 1906. – № 5. – С. 3–4.

5 Якая будзе Дума? // Наша Доля. – 1906. – № 6. – С. 5.

6 Wybory u hosudorstwienuju Dumu // Наша Ніва. – 1906. – № 1. – С. 2–3.

7 Wilnia 13 (26) apryla // Наша Ніва. – 1907. – № 15. – С. 1–2.

8 Вільня 23 лістапада (ноября) // Наша Ніва. – 1906. – № 3. – С. 2.

9 Wilnia 13 (26) janwara (stycznia) // Наша Ніва. – 1907. – № 2. – С. 1–2.

10 Wilnia 25 janwara (stycznia) // Наша Ніва. – 1907. – № 4. – С. 1–2.

11 Wybary // Наша Ніва. – 1907. – № 4. – С. 4–6.

12 Raboty Dumy // Наша Ніва. – 1907. – № 9. – С. 2–3.

13 Zasiedannie 6 marca // Наша Ніва. – 1907. – № 10. – С. 1–2.

14 Zasiedannie 7 marca // Наша Ніва. – 1907. – № 11. – С. 1.

15 Zasiedannie 12 i 13 marca // Наша Ніва. – 1907. – № 12. – С. 1–2.

16 Zasiedannie 18 (31) maja // Наша Ніва. – 1907. – № 19. – С. 1–2.

17 Praekt zakona ab czynszu i miasteczkowaj i haradzkoj arendzi ziamli pad pomy na BieÍaj Rusi maja // Наша Ніва. – 1907. – № 20. – С. 5.

18 Zasiedannie 15 marca // Наша Ніва. – 1907. – № 12. – С. 3–5.

19 Z Biełarusi i Litwy // Наша Ніва. – 1907. – № 1. – С. 4–6.

20 Projekt ziamielnaj reformy, napisany litoŭskimi deputatami (socjał-demokratami) u Hasudarstwienaj Dumie // Наша Ніва. – 1907. – № 19. – С. 5.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ